8. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941–1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 2000. – 1232 S.
9. Архіў Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене (далей – A IfZ). ED 2/I, Bd. 2: Kriegswirtschaft im Operationsgebiet des Ostens in den Jahren 1941–1943.
10. НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 1628: Die Aufstellung für die beim Generalkommissar im Minsk beschäftigten einheimischen Arbeitskräfte vom 1.01.1943. – Bl. 12–29.
11. Літвін, А. М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў; агул. рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Тэсей, 2010. – 584 с.

**Цымбал А.Г.**

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПРАЦОЎНЫХ РЭСУРСАЎ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СВЯТЛЕ КАЛЕКЦЫІ ДАКУМЕНТАЎ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ БЕЛАРУСЬ

Дакументальная спадчына акупацыйных структур Генеральнага камісарыята Беларусь (ГКБ), змешчаная ў Калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь (фонд 370 Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь), уяўляе сабой выключны па значнасці і мала даследаваны комплекс дакументаў, які змяшчае багаты фактычны матэрыял датычны жыцця насельніцтва Беларусі перыяду германскай акупацыі. Установа ажыццяўляла функцыі грамадзянскай адміністрацыі на частцы беларускіх зямель і з’яўлялася ключавым выканаўцам акупацыйнай палітыкі. Матэрыялы Калекцыі даюць уяўленне аб шматлікіх аспектах акупацыйнага жыцця праз прызму дзейнасці акупацыйнай адміністрацыі і праліваюць святло на шматлікія “белыя плямы" выкарыстання эканамічнага патэнцыялу і штодзённага жыцця насельніцтва Беларусі ў гады германскай акупацыі.

Працоўныя рэсурсы з’яўляліся адным з галоўных аб’ектаў інтарэсу акупацыйных структур. Дакументальныя матэрыялы ўтрымліваюць інфармацыю адносна колькасці работнікаў заняных у прамысловасці. Асаблівую цікавасць уяўляе кампаратыўны аспект статыстычных даных па акрузе Беларусь і Балтыйскіх генеральных акругах на 1942 г.У акрузе Латвія налічвалася 109 тыс. рабочых, Эстонія – 53 623, Літва – 33 453, Беларусь – 11 575 рабочых. Доля Беларусі ад агульнай колькасці працаўнікоў, занятых у прамысловасці на усёй тэрыторыі Остланд, складала 5,7% [1, арк. 88-90].

Паказчыкі абароту ў сферы прамысловасці ў тым жа 1942 г. складалі ў Генеральнай акрузе Беларуь 8 761 905рэйхсмарак (РМ). У той час як па Балтыйскім генеральным акругам: Латвія – 344 969 000 РМ, Эстонія – 139 976 000 РМ, Літва – 250 578 000 РМ. Доля генеральнай акругі Беларусь ў прамысловай вытворчасці адносна абароту складала 10% [1, арк. 88–90]. Пры гэтым, акупацыйныя ўлады адзначалі, што па Беларусі трэба было ўлічваць, што гаворка ішла аб мностве рамонтных майстэрань пры прадпрыемствах у Беларусі, якія па сваіх паказчыках з’яўляліся ўскоснымі.

Праблему выкарыстання працоўных рэсурсаў акупаванай Беларусі крыніцы Калекцыі раскрываюць таксама праз прызму дзейнасці бірж працы.

Як пісалася ў нямецкіх дакументах: “Мы павінны імкнуцца да таго, каб псіхалагічна правільна настроіць мясцовае насельніцтва. Калі гэта разнастайнасць умоў будзе выканана, тады стане магчымым перадаць Рэйху ў распараджэнне вялікую колькасць усходніх рабочых, а таксама нямецкай індустрыі, якая з-за налётаў бамбардзіроўшчыкаў павінна вытрымаць цяжкія выпрабаванні і якая ў сувязі з пастаяннай мабілізацыяй нямецкіх рабочых сіл у шэрагі вермахта перажывае крытычныя часы. Мы павінны імкнуцца да таго, каб ва ўласнай эканоміцы дасягнуць павышэння прадуктыўнасці працы сярод беларускіх рабочых, каб, магчыма ня значны эканамічны сектар Беларусі, ўсё-такі па сваіх сілах, па сваёй сыравіне і г.д. мог зрабіць значны вайскова-эканамічны ўнёсак” [2, арк. 78].

Так, у справаздачы аб выніках дзейнасці бірж працы ў Генеральнай акрузе Беларусь ад 9 красавіка 1943 г. паведамлялася, што за тры месяцы 1943 г. было адпраўлена ў Германію 4 тыс. чалавек, што лічылася добрым паказчыкам, але рабілася гэта пры дапамозе паліцыі і войска. Нават германскія ўлады прызнавалі, што мясцовыя работнікі да працы ў Рэйху ставіліся як да высылкі ў Сібір. Нягледзячы на актывізацыю прапагандыфактам заставалася дрэннае абыход-



Репозиторий ВГУ

жанне з людзьмі. Абавязковыя паведамленні аб смерці, якія дасылаліся бацькам не спрыялі даверу да акупацыйных улад, калі, напрыклад, паведамлялася, што20-ці гадовыя людзі паміралі ад сепсісу [2, арк. 82].

Асноўным прадметам пастаянных клопатаў для біржы працы горада Мінска з'яўлялася загатоўка торфу. Планавалася адправіць 12 тыс. рабочых, каб загатаваць прадукцыю на 1943 г.Але дадзеная колькасць рабочых не магла быць забяспечана, у сувязі з адпраўленнем рабочых для патрэб Рэйха. Недахоп складаў ад 5 тыс. да 6 тыс. рабочых.

Акрамя таго біржы працы займалася навучаннем моладзі па дамоўленасці з Арганізацыяй Тодта. Яна забяспечвалі першую прафесійную падрыхтоўку. Юнакоў планавалася накіроўваць на будаўнічыя пляцоўкі, аб'ядноўваць у рамесныя групы і прадстаўляць паўгады працы ў якасці вучняў на вытворчасці. Хто адпавядаў падрабаванням, заставаліся на два гады навучаня, астатнія адпраўляліся назад як некваліфікаваныя [2, арк. 82–85]. Акупацыйныя ўлады лічылі, што падрыхтоўка маладых людзей хутчэй будзе мець вынікі, чым падрыхтоўка рабочых, якія на працягу гадоў знаходзіліся пад уплывам бальшавісцкай прапаганды [3, арк. 76–76б].

Біржа працы ў Вілейцы пачала сваю дзейнасць пасля перадачы ўлады грамадзянскай адміністрацыі 18 кастрычніка 1941 г. Адной з першых задач установа бачыла ажыццяўленне ўліку працоўнай сілы. Была створана картатэка паводле якой налічвалася 48 425 мужчын і 50 454 жанчыны, усяго 98 879 рабочых. Што складала каля 85% работнікаў [2, арк. 87].

Да Вілейскай акругі адносілася 8 раёнаў з 37 сельсаветамі, 27 канюшнямі і 2396 вёскамі. Насельніцтва пераважна арыентавана было на сельскую гаспадарку. Апроч сялянскіх гаспадарак, якія складалі ад 1 до 5 га, існавала яшчэ 139 дзяржаўных гаспадарак. Прамысловасці і гандлю амаль не было, але існавала незлічоная колькасць рамесных майстэрняў. Менавіта рамеснай вытворчасці была прысвечана асобная дырэктыва ГКБ, якой размяркоўваліся задачы перад гэтай галінай гаспадаркі [4, арк. 88-90].

Акупацыйныя ўлады адзначалі вялікую неабходнасць ў працоўных рэсурсах. На тарфяныя працы патрабавался 1115 працоўных, лясныя працы – 1000, рамесную справы – 1120, на патрэбы вермахта – 370, арганізацыю транспартанага руху – 347 і для іншых службаў – 4332 чалавекі.Апроч таго, для Рэйха былі патрэбны навабранцы. Да красавіка 1943 г. у Германію на працу было адпраўлена 6500 чалавек. У справаздачы кіраўніка біржы працы ў Вілейцы апісвалася методыка, як акупанты лавілі людзей на працу: "Звычайна я набіраю рабочых з вёсак, дазваляючы абшукаць дамы з двух бакоў. Потым пасярэдзіне вёскі збіраюць ўсіх і сяляне, без якіх немагчыма было абысціся, адпраўляюцца назад да дому, астатнія ж ідуць з намі. Так за дзень я набраў 45 чалавек. Пры тым, што я пачаў з вялікай вёскі, але калі я падышоў да наступнай вёскі, працоўных мужчынаў там зусім не апынулася. Як паказвае вопыт, тут робіцца зразумелым, што набіраць людзей трэба з наколькі гэта магчыма аддаленых адна ад адной вёсак. Галоўнае тут, паказаць мясцовым жыхарам, што мы настроены сур'ёзна, і што зыходзячы з гэтага мы павінны дасягнуць поспеху"[1, арк. 88]. У Рэйх за 1942 г. было адпраўлена з Вілейкі 16 223 мужчыны і 5 399 жанчын, а з Маладзечна 29 348 мужчын і 5 668 жанчын [2, арк. 89].

У кантэксце выкарыстання працоўных рэсурсаў разглядалася і польскае пытанне, якое адыгрывала ў акрузе важную ролю. Уся ніжэйшая адміністрацыя была занята палякамі, і такім чынам яны атрымалі магчымасць кіраваць гаспадаркай, асабліва сельскай і лясной. Але да пачатку 1942 г. з усіх кіруючых пастоў асобы польскага паходжання былізняты з пасад і іх замянілі на беларусаў. Але, як адзначалі акупацыйныя ўлады, ва ўсіх сферах гэта зрабіць было немагчымым, бо, напрыклад, у лясной гаспадарцы і прамысловасці ўлады не змаглі знайсці ім замену сярод беларусаў. Па меркаванні немцаў гэта было звязана не з тым, што беларусы атрымалі іншую адукацыю, але з тым, што яны мелі зусім іншае прадстаўленне аб рэчах і іншае стаўленне да зямлі, што было абумоўлена знаходжаннем пад савецкім рэжымам [2, арк. 55-61].

На ўлік бралася моладзь. У Маладзечна агульная колькасць склала 2 420 чалавек. Акупацыйныя ўлады імкнуліся да прафесійнага навучання маладога пакалення з мэтай забеспячэння працоўных патрэб. У выніку размоў з моладдзю Вілейкі высветлілася, што з 164 хлопцаў і 160 дзяўчын толькі трое хлопцаў і две дзяўчыны не хацелі вучыцца. З дзецьмі была тая самая карціна, з 50 дзяцей 45 хацелі стаць настаўніамі. Рамяство было менш запатрабавана і не многія хацелі яго вывучаць [2, арк. 89].



Рэпазіторый БГУ

У справаздачы кіраўніка біржы працы Баранавіч адзначалася, што ў акрузе пражывала 341 522 жыхара, усяго ў раёне дзейнічала тры біржы працы. Эканамічная сітуацыя ў вобласці абумоўлена наяўнасцю сельскай гаспадаркі. Прамысловасць адсутнічала. Спажыўцамі з'яўляліся дзяржаўная чыгунка, дарожнае будаўніцтва, арганізацыя Тодта, тарфяная галіна і Вермахт, яны размяшчаліся ў акругавых гарадах і Баранавічах. Узровень занятасці насельніцтва ўлады ацэньвалі наступным чынам. Пры насельніцтве ў 350 000 чалавек 40% былі працаздольныя, што складала каля 140 000 чалавек, з якіх 122 000 ужо былі зарэгістраваны[2, арк. 91].

Вырашэнне яўрэйскага пытання сустракала, па словах нямецкіх чыноўнікаў, цяжкасці, бо сярод яўрэяў большасць былі кваліфікаваныя рабочыя. З мэтай іх замяшчэння актывізавалася навучанне моладзі.

У цэлым адносіны насельніцтва да працы на акупацыйныя структуры ўлады характарызавалі як негатыўныя. Узнікала ўсё больш выпадкаў, калі людзі не з'яўляліся на працу, а заявы ў паліцыю не давалі пажаданых вынікаў. Служба бяспекі атрымлівала звесткі, арганізоўвала аблавы і хацела адправіць людзей у Германію, што выклікала беспарадкі.

У Рэйх за першыя месяцы 1943 г. было накіравана 3 256 рабочых [2, арк. 95–96]. У першую чаргу для Германіі разглядаліся пераважна маладыя рабочыя. Як адзначалі ўлады, палякі адмаўляліся ад медыцынскага агляду, беларусы прасіліся самі. Палякі не жадалі насіць у Германіі знак «F», а аддавалі перавагу знаку працоўнага з Усходу.

Умовы жыцця насельніцва ў крыніцах апісваюцца як вельмі цяжкія. Людзі на сваю зарплату не маглі пакрыць жыццёвыя патрэбы, калі яны адначасова не вялі гаспадарку. Калі рабочы працаваў у горадзе і яго зарплаты не хапала на жыццё, ён набываў тавары на чорным рынку і забменьваў іх [2, арк. 91–96]. У сваю чаргу ўлады сцвярджалі аб неабходнасці спыніць нелегальны гандаль.

Паводле матэрыялаў Калекцыі можна аднавіць структуру прамысловасці Мінска перыяду нямецкай акупацыі. У горадзе функцыянавалі: 150 буйных прадпрыемстваў, 20 прадпрыемстваў па здабычы і апрацоўцы жалеза і металу, 14 тэкстыльных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў па вырабе скуры, 15 друкарскіх фабрык і паперняў, 21 транспартнае прадпрыемства, 3 энергапрадпрыемства, 41 будаўнічы арганізацый, 6 лесапільняў, 13 харчовых прадпрыемстваў, 7 хімічных і будаўнічых прадпрыемстваў, акрамя таго 180 вайсковых і грамадзянскіх устаноў [2, арк. 97].

У горадзе пражывала 105 000 чалавек, з якіх 56 000 былі зарэгістраваны ў якасці рабочых, але задзейнічана на працы было толькі 35 000, акрамя 8 500 яўрэяў і 3 190 ваеннапалонных.

Насельніцтва не выказывала жадання працаваць на акупантаў. З выклікам тых людзей, якія не былі задзейнічаны, ва ўлад былі вялікія цяжкасці. Тыя, хто атрымалі позву, з'яўляліся толькі ў невялікай колькасці і звычайна іх прыводзіла паліцыя. Увага звярталася на моладзь. Адзначалася, што жаданне юнакоў атрымаць прафесію было вельмі вялікае. Уводзіліся майстэрні на чыгуначнай станцыі, радыё фабрыкі і філіялы арганізацыі Тодта. Вучні характарызаваліся як вельмі добрыя [2, арк. 100].

Пастаянная пагроза для дзейнасці акупацыйных улад сыходзіла ад партызанаў. Як адзначалася ў красавіку 1943 г. партызаны адабралі каля 66 000 тон збожжа, драўніны і бульбы, а таксама 25 000 штук крупна рагатай жывёлы, коней і авечак. У Слуцкай акрузе з 20 саўгасаў партызанамі было знішчана 19.Мясцовая ахоўная паліцыя разглядалася ўладамі як самыя вялікія разбойнікі. Як адзначаў кіраўнік Вілейскай акругі 8 красавіка 1943 г., партызаны наносілі большы ўрон чым ваенныя падзеі [2, арк. 55-61].

Такім чынам, матэрыялы Калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь (фонд 370 Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь) утрымліваюць вялізарны аб'ём новай фактычнай інфармацыі адносна эканамічнага выкарыстання беларускіх тэрыторый акупацыйнымі ўладамі і паўсядзённага жыцця грамадства. Унікальная інфармацыя крыніц дазваляе істотна пашырыць фактаграфічную базу даследванняў гісторыі перыяду германскай акупацыі Беларусі, а таксама ўдакладніць палажэнні айчыннай гістарыяграфіі датычныя страт гаспадаркі і насельніцтва за гады акупацыі.

Шмат увагі крыніцы надаюсь т. зв. “польскаму пытанню” і “яўрэйскаму пытанню”. Першае ўяўляла сабой для акупантаў неабходнасць выдалення з кіруючых структур усіх асоб польскага



Рэпазіторый ВДУ

паходжання і замены іх беларусамі. Аднак тут яны сутыкаліся з праблемай пошуку падрыхтаваных кадраў. У эканамічным аспекце разглядалася і "канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання", што прыводзіла да дэфіцыта працоўнай сілы, бо яўрэі ўяўлялі сабой у асноўным кваліфікаваных работнікаў.

Інфармацыя крыніц Калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь дае вялікую колькасць новых фактылагічных дадзеных па гісторыі германскай акупацыі Беларусі, увядзенне якіх у навуковы зварот ставіць перад даследчыкамі навуковыя пытанні аб ўмовах выжывання розных груп насельніцтва у рэгіёнах акупаванай тэрыторыі Беларусі, палітыкі адносна этнічнай структуры грамадства, а таксама нацысцкіх планаў адносна беларускіх зямель.


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1071.
2. НАРБ. – Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1264.
3. НАРБ. – Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1092.
3. НАРБ. – Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1124.



**Гребень Е.А.**


## ПОВСЕДНЕВНЫЕ РЕАЛИИ ЖИЗНИ БЕЛОРУССКИХ КРЕСТЬЯН В УСЛОВИЯХ НАЦИСТСКОЙ ОККУПАЦИИ (ПО МАТЕРИАЛАМ ВОЛОСТНОЙ АДМИНИСТРАЦИИ)

Экономическая политика нацистов в оккупированной Беларуси находится в фокусе внимания исследователей на протяжении многих десятилетий по окончании Великой Отечественной войны. Изучены мероприятия оккупационных властей в рамках экономической эксплуатации захваченных территорий, определены масштабы ущерба, понесенного Беларусью за период оккупации [1, 2, 3, 7]. В то же время существует дальнейший потенциал для детального изучения проблемы на локальном примере. В статье будут рассмотрены повседневные реалии жизни белорусских крестьян в условиях нацистской оккупации на примере отдельных волостей Петриковского района за период 1942 г. – первая половина 1943 гг.

Одной из реалий оккупации стало привлечение гражданского населения на принудительные работы. Для этого местной вспомогательной администрацией проводился учет местных жителей. Так, в деревне Мицуры насчитывалось 150 детей до 16-ти лет, 43 мужчины в возрасте от 16 до 60-ти лет (то есть трудоспособных) и 75 женщин [5, л. 169]. Из 115-ти крестьян, которые могли быть привлечены к выполнению обязательной трудовой повинности, 40 женщин значились как домохозяйки (очевидно, на работах в первую очередь их не использовали), 14 человек было занято на охране железной дороги, двое являлись бакенщиками на реке, четверо крестьян исполняли обязанности сельского старосты, заместителя старосты, десятидворника и заведующего сливным пунктом, остальные были заняты на заготовке и вывозе леса [5, л. 173–174 об.]. Жители деревни Конковичи привлекались к охране железной дороги (74 мужчины), заготовке леса (29 мужчин и женщин), вывозке леса (51 мужчина и женщина, 29 волов) [5, л. 40–43 об.].

Реакцией немцев на активность партизан было сожжение деревень и уничтожение местного населения. Чувствуя угрозу своей жизни, крестьяне уходили к родственникам в другие населенные пункты, где было спокойнее, или в леса. Озабоченные оттоком населения, потерей рабочей силы, Петриковский гебитскомиссар и жандармерия в январе 1943 г. обращались к беженцам с требованием немедленно вернуться по домам [4, л. 172].

Для эффективной эксплуатации оккупированных территорий проводился мониторинг наличия скота и земли в крестьянских хозяйствах. Например, по состоянию на 1 января 1943 г. в деревне Мицуры Конковичской волости у крестьян имелось 24 рабочих лошади, жеребец-производитель, 23 вола, 54 коровы и бык-производитель. Часть скота значилось как колхозный, находящийся на содержании у крестьян [5, л. 175–179]. Сохранились данные об оснащенности крестьян деревни инвентарем. В частности, в деревне имелось 13 плугов, 16 борон, 12 возов, молотилка, веялка, косилка, грабарка, 36 лопат, 48 мотыг, 67 граблей [5, л. 171]. Производились также обмеры озимых и яровых посевов с фиксацией фамилий крестьян и выращиваемых ими сельскохозяйственных культур (рожь, картофель, ячмень, лен, пшеница и другие) по населен-

Репозиторий ВГУ